**І. М. Панкоў,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**
**вышэйшай катэгорыі**
**Сакалоўскай СШ Чэрыкаўскага раёна**

# Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі

## Урок беларускай мовы ў 7 класе

**Адукацыйная мэта:** мяркуецца, што ў выніку дзейнасці вучні будуць

***ведаць***: разрады прыназоўнікаў паводле паходжання (вытворныя і невытворныя); асаблівасці ўтварэння вытворных прыназоўнікаў шляхам пераходу ў разрад службовай часціны мовы некаторых формаў назоўнікаў, прыслоўяў і дзеепрыслоўяў

***умець:*** вызначаць вытворныя і невытворныя прыназоўнікі ў словазлучэннях і сказах, адрозніваць формы назоўнікаў, прыслоўяў і дзеепрыслоўяў ад аманімічных вытворных прыназоўнікаў, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні невытворныя і вытворныя прыназоўнікі.

**Задачы:**

1) садзейнічаць развіццю ў вучняў уменняў параўноўваць, аналізаваць, выказваць уласныя меркаванні, абагульняць, рабіць вывады;

2) ствараць умовы для развіцця навыкаў сама- і ўзаемакантролю, рэфлексійнай дзейнасці, камунікатыўнай культуры праз работу ў парах.

**Выхаваўчыя задачы:** садзейнічаць выхаванню цікавасці да беларускіх народных промыслаў; ствараць умовы для выхавання культуры ўзаемадзеяння.

**Прагнозны вынік урока:** мяркуецца, што ў канцы ўрока вучні будуць умець фармуляваць азначэнне невытворных і вытворных прыназоўнікаў, ведаць спосабы адрознення форм назоўнікаў, прыслоўяў і дзеепрыслоўяў ад аманімічных вытворных прыназоўнікаў, умець адрозніваць гэтыя моўныя адзінкі.

**Тып урока**: камбінаваны.

**Абсталяванне**: мультымедыйны праектар, экран, камп’ютар.

**Дыдактычнае забеспячэнне ўрока**: лісты кантролю (дадатак 1); апорныя табліцы “Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі”, “Адрозненне вытворных прыназоўнікаў ад аманімічных назоўнікаў, прыслоўяў і дзеепрыслоўяў” (дадатак 2); карткі для замацавання (дадатак 3); карткі з тэставымі заданнямі (дадатак 4).

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.** (*Слайды 1, 2*)

Сённяшні ўрок мне хацелася б пачаць са слоў вядомага англійскага пісьменніка Бернарда Шоу: "Калі ў вас ёсць яблык і ў мяне ёсць яблык і калі мы памяняемся гэтымі яблыкамі, то і ў мяне і ў вас застанецца па адным яблыку. А калі ў вас ёсць ідэя, і ў мяне ёсць ідэя і мы памяняемся ідэямі, то ў кожнага з нас будзе па дзве ідэі". Спадзяюся, што ў нас з вамі сёння на ўроку будзе шмат ідэй і ў канцы ўрока ўсе вашы ідэі прынясуць вам поспех і задавальненне, а самае галоўнае – новыя веды. А для таго каб атрымаць веды, трэба, канешне, актыўна працаваць. Дэвіз нашага ўрока: "Не папрацаваўшы, ведаў не набудзеш". Помніце гэтыя словы на працягу ўсяго нашага ўрока па тэме "Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі".

*Тлумачэнне ўмоў работы на ўроку.*

**II. Праверка д/з.**

1) Вуснае апытванне па тэме "Групы прыназоўнікаў па значэнні". Метад "незакончаны сказ".

- Прыназоўнікі ў спалучэнні з самастойнымі часцінамі мовы могуць выражаць наступныя значэнні… (**прасторавыя, часавыя, аб'ектныя, прычынныя, мэтавыя, азначальныя, спосабу дзеяння**).
- Прасторавыя прыназоўнікі абазначаюць… (**месца**), адказваюць на пытанне… (**дзе?**).
- Адказваюць на пытанне калі? прыназоўнікі з ... (**часавым значэннем**).
- Указваюць на прадмет… (**аб'ектныя**) прыназоўнікі.
- Адказваюць на пытанні чаму?, па якой прычыне?... (**прычынныя**) прыназоўнікі.
- У словазлучэннях *рыхтавацца да ўрокаў, дарожка для язды* ад галоўнага да залежнага слова задаём пытанне … (**з якой мэтай?**), прыназоўнікі *да, для* выражаюць… (**мэтавае значэнне**).
- Азначальныя прыназоўнікі абазначаюць… (**прымету прадмета**), адказваюць на пытанні… **(які? якая? якое?).**
- У словазлучэннях *дзяліць па справядлівасці, чытаць з захапленнем* ад галоўнага да залежнага слова ставім пытанне … (**як?**), прыназоўнікі *па, з* выражаюць… (**значэнне спосабу дзеяння**).

2) Самаправерка пр. 245 (*Слайд 3*). Выстаўленне адзнак у лісты кантролю.




<u>Дадатковыя пытанні:</u>

- Якой агульнай тэмай аб’яднаныя ўрыўкі з вершаў П. Панчанкі?
- Якія вобразныя сродкі выкарыстаў паэт?

**III. Матывацыя і мэтавызначэнне.**

Метад “Так ці не”. *<u>(Слайды 4, 5</u>)*







Прыназоўнік – гэта службовая часціна мовы. (Так)

Прыназоўнікі ў словазлучэннях заўсёды стаяць перад назоўнікам. (Не)

У сказе прыназоўнік можа выконваць функцыю любога члена сказа. (Не)

У словазлучэнні *жывуць ля возера* слова *ля* – гэта невытворны прыназоўнік. (?)

У словазлучэнні *стаялі абапал* слова *абапал* – гэта прыслоўе. (?)

У словазлучэнні *стаялі абапал хаты* слова *абапал* – гэта вытворны прыназоўнік. (?)

• Паспрабуйце вызначыць мэты сённяшнага ўрока. *(Слайд 6)*




**IV. Засваенне новых ведаў і спосабаў дзейнасці.**




• Выпішыце са сказаў словазлучэнні з прыназоўнікамі.

• Успомніце, якімі спосабамі могуць утварацца словы ў беларускай мове.

• Якімі спосабамі ўтварыліся нашы прыназоўнікі?

Вывады вучняў пра вытворныя і невытворныя прыназоўнікі.

Работа ў парах. Чытанне правіла, запаўненне апорных табліц "Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі". Праверка правільнасці запаўнення табліцы. *(Слайд 8)*



Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі

| Прыназоўнікі | Прыкметы | Прыклады |
|---|---|---|
| Невытворныя | Паходжанне вызначыць цяжка ці немагчыма | *А, аб, акрамя, без, да, дзеля, для, за, на, цераз, па, пра, праз, пры…* |
| Вытворныя | Паходзяць ад назоўнікаў прыслоўяў, дзеепрыслоўяў | *За выключэннем, з прычыны, на чале, у выніку…* *Абапал, вакол, збоку, пасля, уздоўж…* *Выключаючы, дзякуючы, гледзячы на, уключаючы* |

(*Слайд 9*) Калектыўны аналіз сказаў.

| | |
|---|---|
| ***Вакол*** *ляжала маўклівае пустое поле.* | ***Вакол*** *старога парку і саду шуміць збажына.* |
| *Гэтым* ***шляхам*** *праходзілі нашы войскі.* | ***Шляхам*** *параўнання мы вызначылі часціну мовы.* |

Давайце паспрабуем у сказах вызначыць словазлучэнні.

Для чаго служаць выдзеленыя словы ў гэтых словазлучэннях? Давайце паспрабуем паставіць да іх пытанні. Ці маюць яны самастойнае лексічнае значэнне? Ці з'яўляюцца членам сказа?

Такім чынам, **прыназоўнік** служыць для сувязі слоў у словазлучэнні, сам па сабе не з'яўляецца членам сказа, не мае лексічнага значэння, да яго нельга паставіць пытанне. Аманімічныя прыслоўі, назоўнікі, дзеепрыслоўі маюць самастойнае лексічнае значэнне, з'яўляюцца членам сказа, да іх можна паставіць пытанне.

Работа ў парах. Запаўненне апорнай табліцы. Узаемакантроль.

**V. Замацаванне.**

1. Работа каля дошкі над практ. 247.

***Фізкультхвілінка***

Настаўнік называе сказы з прыназоўнікамі. Калі ў сказе ёсць невытворны прыназоўнік, вучні павінны прысесці, калі вытворны – зрабіць нахіл уперад.

*Дарога была скрозь высаджана дрэвамі.*

*Скрозь галіны дрэў скупа прабіваўся тужлівы бляск месяца.*

*Наталля павярнулася да бацькі.*

*Упоперак ляжалі нейкія межы з кустамі.*

2. Самастойная работа з заданнямі картках. (*Слайд 11*) Калектыўная праверка правільнасці выканання заданняў. Самакантроль. Выстаўленне адзнак у лісты кантролю. (*Слайд 5.*)

**VI. Кантроль ведаў.**

Выкананне тэставых заданняў. Самакантроль. (*Слайд 12*)




**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

**VIII. Рэфлексія.** Метад “незакончаны сказ” (*Слайд 13*)




**IX. Д/з.** & 34, практ. 248, дадатковае заданне: знайсці і запісаць тэкст пра беларускі народны промысел, каб у ім ужываліся вытворныя прыназоўнікі. *Слайд 14*.

**Дадатак 1**

Ліст кантролю па тэме “Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі”

| **Прозвішча:** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Заданне | Дамашняе практыкаванне 245 | Пераказ апорнай табліцы | Работа з карткай | Тэст | Вынік |
| Адзнака | | | | | |

**Дадатак 2**

**Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі**

| **Прыназоўнікі** | **Прыкметы** | **Прыклады** |
|---|---|---|
| ***Невытворныя*** | Паходжанне вызначыць ____________________________ | *А, аб, акрамя, без, да, дзеля, для, за, на, цераз, па, пра, праз, пры…* |
| ***Вытворныя*** | Паходзяць ад ______________________ ______________________ ______________________ | *За выключэннем, з прычыны, на чале, у выніку… Абапал, вакол, збоку, пасля, уздоўж… Выключаючы, дзякуючы гледзячы на, уключаючы* |

**Адрозненне прыназоўнікаў ад аманімічных назоўнікаў, прыслоўяў, дзеепрыслоўяў**

| | |
|---|---|
| 1. Служыць для сувязі слоў у словазлучэнні. Сам па сабе не з’яўляецца членам сказа. | 1. З’яўляюцца членам сказа. |
| 2. Не мае лексічнага значэння. | 3. Маюць самастойнае лексічнае значэнне. |
| 3. Да яго нельга паставіць пытанне. | 3. Да іх можна паставіць пытанне. |

**Дадатак 3**

**Картка для замацавання па тэме “Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі”**

Заданне 1. Прачытайце сказы. Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы. У дужках укажыце часціну мовы.

1. Сцяпан ішоў, ***не гледзячы*** (     ) па баках.
2. Зімовым вечарам, ***нягледзячы на*** (     ) холад, вуліца звінела ад дзіцячых галасоў.
3. Я стаю ***насупраць*** (     ) свайго купэ і гляджу ў акно.
4. Каманду набіралі **з ліку** (     ) самых дужых хлопцаў.

Заданне 2. Складзіце і запішыце сказ з адным з прапанаваных вытворных прыназоўнікаў.

Дзякуючы, на працягу, у выніку, у адпаведнасці.

**Дадатак 4**

**Тэст па тэме “Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі”**

1. Адзначце ад якіх самастойных часцін мовы могуць паходзіць вытворныя прыназоўнікі:

а) ад прыметнікаў; в) ад лічэбнікаў; д) ад дзеепрыслоўяў.

б) ад назоўнікаў; г) ад прыслоўяў;

2. Адзначце прыкметы невытворных прыназоўнікаў, аманімічных самастойным часцінам мовы.

а) служаць для сувязі слоў у словазлучэнні:

б) маюць самастойнае лексічнае значэнне;

в) да іх можна паставіць пытанне;

г) не маюць лексічнага значэння;

д) да іх нельга паставіць пытанне;

е) самі па сабе не з’яўляюцца членамі сказа.

3. Адзначце сказы, у якіх ёсць вытворныя прыназоўнікі.

а) Надзвычай урачыстымі здаваліся дрэвы, паскідаўшыя снегавыя шапкі і зімовую панурасць.

б) Зямля здаецца бязважкай, яна ўся дыхае цішай, спакоем.

в) Абапал дарогі стаялі тоўстыя сосны.

г) Насустрач ляцела начная дарога.

д) На працягу дня надвор’е мянялася некалькі разоў.